**Мандат офісу АБСЭ ў Менску працягнуты да 31 сьнежня 2009 году**

**Абышлося вымоваю**

**Узровень школьнай адукацыі ў Беларусі няўхільна зьніжаецца**

**Беларусь адмаўляецца ад даляра**

**«Залатыя апостраф» уручаны**

**Міліцыя па-ранейшаму выкарыстоўвае «экспэрымэнты» і адмяняць іх ня хоча**

Важнай падзеяй у галіне СМІ стала вяртаньне газэтаў «Наша Ніва» і «Народная воля» ў шапікі «Белсаюздруку» і падпісныя каталёгі «Белпошты». Гэтыя падзеі не зьмянілі характар узаемадачыненьняў уладаў зь незалежнай прэсай, але, тым ня менш, служаць знакам зьмякчэньня палітычнага клімату ў краіне.

Газэта «Народная воля» заключыла дамовы зь «Белсаюздрукам» і «Белпоштай» на распаўсюд выданьня праз сетку распаўсюду дзяржаўных манапалістаў. Акрамя таго, галоўны рэдактар «Народнай волі» Ёсіф Сярэдзіч заключыў дамову з Домам друку на паліграфічныя паслугі (дагэтуль газэта друкавалася ў Смаленску). Газэта ўжо зьявілася ў шапіках «Белсаюздруку».

Паводле шэф-рэдактара «Нашай Нівы» Андрэя Дынько, газэта заключыла дамову зь «Белпоштай», і ёй, як «Народнай волі», прысвоены падпісны індэкс.

Умовы вяртаньня выданьняў у манапольную дзяржаўную сыстэму распаўсюду даволі жорсткія: «Белсаюздрук» і «Белпошта» забіраюць сабе 55% адпускной



photo.bymedia.net

цаны; дамова можа быць разарваная, калі распаўсюд акажацца нерэнтабэльным; дамова можа быць разарваная, калі вяртаньне выданьняў складае больш за 30%; пры вяртаньні больш за 10% «Белсаюздрук» можа скараціць колькасьць асобнікаў, якія ён прымае на рэалізацыю.

Варта адзначыць таксама, што няма ніякай магчымасьці незалежнай ацэнкі рэнтабэльнасьці продажаў незалежных выданьняў дзяржаўнымі манапалістамі, як няма такой магчымасьці ў дачыненьні да вяртаньня, то бок непрададзеных асобнікаў выданьняў.

Пры гэтым колькасьць асобнікаў, што прымаюцца на рэалізацыю «Белсаюздрукам», абмежаваная па Менску для «Народнай волі» 2500 ас. і для «Нашай Нівы» 1400 ас.

Што тычыцца ўзаемадачыненьняў СМІ і дзяржавы ў цэлым, пакуль ніякіх пэрспэктываў іх прынцыповай зьмены не прадбачыцца. Умовы акрэдытацыі журналістаў, уведзеныя

новым законам пра СМІ, застаюцца такімі жа жорсткімі, самавольства чыноўнікаў у адносінах да кваліфікаваньня зьместу СМІ нічым не абмежаванае (апошні прыклад – затрыманьне на мяжы часопісу «Arche» за «экстрэмісцкі зьмест»), неравенства эканамічных і адміністрацыйных умоваў для дзяржаўных і незалежных СМІ.

Пазыцыю ўладаў выклаў начальнік упраўленьня электронных СМІ Міністэрства інфармацыі Генадзь Курбека: «Калі штосьці ўплывае на грамадзкую думку, значыць, гэта павінна быць рэгуляваным».

Вяртаньне двух выданьняў у сыстэму распаўсюду выклікала самыя супярэчлівыя ацэнкі – ад асьцярожнага аптымізму БАЖ і некаторых экспэртаў да абвінавачаньня ў згодніцтве і здрадзе беларускай дэмакратычнай супольнасьці.

Другая пазыцыя ў найбольш зразумелай форме была выказаная беларускай журналісткай Ірынай Халіп на сайце «Хартыя-97» і зыходзіць з патрэбаваньня імгненных і рэзкіх узаемадачыненьняў дзяржавы і прэсы. Такая пазыцыя не прызнае асьцярожны аптымізм тых журналістаў і экспэртаў, якія схільныя да эвалюцыйнага падыходу да вырашэньня дадзенай праблемы.




У эканамічнай галіне прыцягнуў увагу праект закону пра ўнясеньні зьменаў і дапаўненьняў у закон пра валютнае рэгуляваньне і валютны кантроль. Праект закону ўнесены ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу прэзыдэнтам краіны. У ім, у прыватнасьці, утрымліваецца палажэньне пра тое, што валютныя апэрацыі, зьвязаныя з даваньнем і атрыманьнем крэдытаў ці пазыкаў, незалежна ад тэрміну іх ажыцьцяўленьня плянуецца аднесьці да валютных апэрацыяў, зьвязаных з рухам капіталу, якія прадугледжваюць дазвольны парадак ажыцьцяўленьня.

«Праектам прадугледжваецца валютныя апэрацыі, непасрэдна зьвязаныя з адтокам і прытокам капіталу, – даваньне і атрыманьне крэдытаў і (ці) пазыкаў незалежна ад тэрміну іх ажыцьцяўленьня – аднесьці да валютных апэрацыяў, зьвязаных з рухам капіталу», – гаворыцца ў накіраваным у ніжнюю палату парлямэнту абгрунтаваньні неабходнасьці прыняцьця законапраекту, падпісаным старшынём праўленьня Нацыянальнага банку Беларусі Пятром Пракаповічам.

«Усталёўваньне шэрагу абмежаваньняў на валютныя апэрацыі, зьвязаныя з рухам капіталу, абгрунтоўваецца неабходнасьцю забесьпячэньня недапушчэньня адтоку капіталу падчас крызысных зьяваў у эканоміцы краіны, калі пытаньне стабільнасьці нацыянальнай валюты і па сутнасьці эканомікі ў цэлым павінна вырашацца максымальна апэратыўна. Для апэратыўнага рашэньня задачаў і дасягненьня ўсталяваных Банкаўскім кодэксам мэтаў дзейнасьці Нацбанку апошні павінен мець адпаведныя інструмэнты, адным зь якіх зьяўляецца дазвольны парадак ажыцьцяўленьня асобных апэрацыяў, зьвязаных з адтокам капіталу, незалежна ад тэрміну іх правядзеньня», – таксама адзначаецца ў абгрунтаваньні.

У цяперашні час даваньне і атрыманьне крэдытаў і пазыкаў ад нерэзыдэнтаў на тэрмін да 180 дзён адносіцца да бягучых валютных апэрацыяў плацёжнага балянсу, якія прадугледжваюць паведамляльны парадак ажыцьцяўленьня.

У абгрунтаваньні таксама адзначаецца, што дазвольны парадак дадзеных апэрацыяў «мае рэгулятыўную функцыю ў пэрыяд спакою на фінансавым рынку Беларусі і будзе мець кантралюючую функцыю ў пэрыяд часовай нестабільнасьці на рынку».

Законапраектам таксама плянуецца зь пераліку валютных апэрацыяў, зьвязаных з рухам капіталу, выключыць разьлікі па пагадненьнях, якія прадугледжваюць экспарт ці імпарт (больш за 180 дзён), і аднесьці іх да бягучых валютных апэрацыяў.

Паводле інфармацыі Нацбанку, у першым паўгодзьдзі 2008 г. чысты прыток капіталу па ліку апэрацыяў з капіталам і фінансавых апэрацыяў плацёжнага балянсу (у аналітычным прадстаўленьні) скараціўся на 24,5% да 1,296 млрд даляраў. Статыстычныя дадзеныя плацёжнага балянсу Беларусі за тры кварталы 2008 г. будуць апублікаваныя 15 сьнежня.

У фінансавым рахунку плацёжнага балянсу актывы ўключаюць апэрацыі, зьвязаныя зь інвэстыцыямі рэзыдэнтаў Беларусі за мяжу. У абавязальніцтвах адлюстроўваюцца зьмены аб'ёмаў інвэстыцыяў нерэзыдэнтаў у эканоміку Беларусі.

Плянуецца, што дадзены законапраект будзе разгледжаны ніжняй палатай парлямэнту ў першым чытаньні падчас восеньскай сэсіі.

Варта адзначыць і тую значную падтрымку, якая паводле распараджэньня Лукашэнкі была нададзеная «Белаграпрамбанку». Некаторыя экспэрты лічаць, што банк аказаўся на мяжы адмовы ад выкананьня абавязальніцтваў з-за незаменных выдаткаў, прычынай якіх стала падтрымка аграпрамысловага комплексу. Паводле некаторых дадзеных, «Беларусбанк» таксама зьвярнуўся з просьбай пра наданьне яму істотнай падтрымкі.

ПАЛІТЫКА

## Мандат офісу АБСЭ ў Менску працягнуты да 31 сьнежня 2009 году

*Такое рашэньне прынятае 27 лістапада на паседжаньні Пастаяннага савету Арганізацыі па бясьпецы і супрацоўніцтве ў Эўропе.*

Паводле сьцьверджаньня беларускага Міністэрства замежных справаў, афіцыйны Менск даў сваю згоду на прыняцьце гэтага рашэньня ў беспрэцэдэнтна кароткія тэрміны.

*БелаПАН*

АПАЗЫЦЫЯ

## Абышлося вымовай

*Актывісткі незарэгістраванай арганізацыі «Малады фронт» Тацьцяна Шапуцька й Анастасія Лойка атрымалі вымову ад дэканату юрыдычнага факультэту БДУ за ўдзел у пікеце «Камунізм пад трыбунал», які адбыўся 7 лістапада каля будынку КДБ у Менску.*

Кіраўніцтва юрыдычнага факультэту склікала адмысловую раду, на якой разглядалася пытаньне актывістак. Рашэньне рады пра вымову мае рэкамэндацыйны характар. Канчатковую пастанову павінен выдаць рэктар Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту, які можа нават адлічыць студэнтак.

ГРАМАДЗТВА

## Узровень школьнай адукацыі ў Беларусі няўхільна зьніжаецца

*У апошнія гады агульны ўзровень падрыхтоўкі выпускнікоў сярэдняй школы падае. Пра гэта заявіў дырэктар Рэспубліканскага інстытуту кантролю ведаў Мікалай Фяськоў.*

Паводле ягоных словаў, заданьні цэнтралізаванага тэставаньня (ЦТ) у апошнія гады даводзілася спрашчаць. Пры гэтым па выніках 2008 году колькасьць тых, хто ня выканаў заданьні, застаецца стабільна высокай. Так, 1,7% абітурыентаў не набралі ні аднаго бала на выпрабаваньнях па матэматыцы.

Паводле словаў М. Фяськова, у 2008 годзе высокія вынікі ЦТ паказалі абітурыенты, якія скончылі школу ў 1996 годзе і раней. Звычайна ж у абітурыентаў, якія здаюць ЦТ праз год або некалькі гадоў пасьля выпуску, вынікі выпрабаваньняў атрымліваюцца ніжэй, чым у астатніх. На думку адмыслоўца, такая сытуацыя сьведчыць пра паніжэньне ўзроўню школьнай падрыхтоўкі за апошняе дзесяцігодзьдзе.

Усяго ў 2008 годзе ў ЦТ прынялі ўдзел 176 тыс. чалавек, якія выканалі 457,3 тыс. тэстаў.

*БелаПАН*

ЭКАНОМІКА

## Беларусь адмаўляецца ад даляра


photo.bymedia.net

*Пра гэта сёньня заявіў першы намесьнік старшыні праўленьня Нацыянальнага банку Павал Калаўр у выступе перад дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў.*

Ён адзначыў, што, пачынаючы з 2009 году, беларускі рубель будзе прывязаны не да даляра, як было раней, а да «кошыка валют» (даляра, эўра і расейскага рубля). Дынаміка даляра сёлета

рэзка зьмянялася, таму й вырашана прывязаць рубель да кошыка валют.

Паводле спадара Калаўра, асноўныя кірункі дзяржаўнай фінансавай палітыкі прадугледжваюць, што даляр сёлета будзе каштаваць 2100—2200 беларускіх рублёў.

*"Радыё Свабода"*

КУЛЬТУРА

## «Залаты апостраф» уручаны

***Ляўрэатамі прэміі літаратурна-мастацкага часопісу «Дзеяслоў» за 2007 год сталі паэты Ірына Бельская й Андрэй Хадановіч ды празаік Кастусь Тарасаў. Урачыстае ўручэньне прэміі «Залаты апостраф» адбылося 3 сьнежня ў менскім Палацы мастацтваў у рамках кампаніі «Будзьма», паведамляе БелаПАН.***

Адмысловасьцю «Залатога апострафа» зьяўляецца тое, што прэмію атрымліваюць толькі тыя айчынныя пісьменьнікі, якія не атрымалі Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Паводле галоўнага рэдактара «Дзеяслова» Барыса Пятровіча, такі падыход спрыяе зьяўленьню новых імёнаў у беларускай літаратуры.

ТЭНДЭНЦЫІ

## Міліцыя па-ранейшаму выкарыстоўвае «экспэрымэнты» і адмяняць іх ня хоча




***Былыя дэпутаты Палаты прадстаўнікоў спрабавалі, але ня здолелі забараніць міліцыянтам праводзіць «апэратыўныя экспэрымэнты», таму сьледчыя па-ранейшаму імі карыстаюцца.***

Як стала вядома «Эўрарадыё», дэпутаты новага скліканьня абмяркоўваць законнасьць такіх экспэрымэнтаў пакуль не зьбіраюцца.

CENTRUM STOSUNKÓW MIĘDZYNARODOWYCH
CENTER FOR INTERNATIONAL RELATIONS

АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ БЕЛАРУСКАЯ

EUROPEAN RADIO FOR BELARUS

polska pomoc

There are various sites devoted to events in Belarus, which are, however, little known in Western Europe, and among people dealing with politics towards Belarus who do not understand the Russian or Belarusian languages.

The site belarus-live fills this gap. The site allows to order weekly reception of news in English, Polish, Belarusian, Russian.